**Арцішэўскі А. А**
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт*
*Беларусь, Мінск*

# НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ Ў ВЫХАВАННІ СУЧАСНАЙ МОЛАДЗІ

Адзначаючы саракапяцігоддзе кафедры Беларускай і рускай мовы БДМУ і выкладчыкі універсітэта, і шматлікія госці з родственных кафедраў ВНУ Рэспублікі Беларусь, а таксама госці з замежжа даюць вельмі высокую ацэнку працы гэтагавялікага і вельмі працавітага калектыву. Дзякуючы іх ўнёску ў справу авалодання рускай мовай студэнтамі з Афрыкі, Азіі, Паўночнай і Паўднёвай Амерык наш БДМУ занесены на Дошку Гонару Рэспублікі за падрыхтоўку спецыялістаў-замежнікаў. Пра іх выкладчыцкае майстэрства, творчы падыход да справы, неабыякавае стаўленне да студэнтаў-замежнікаў выказана шмат прыемных і заслужаных слоў як прафесіяналамі філолагамі, так і людзьмі, якія самі тут вучылся, скончылі наш універсітэт, а сёння з’яўляюцца прызнанымі спецыялістамі-медыкамі на сваёй радзіме. Так, кафедра робіць важную і адказную справу, у тым ліку і папаўняючы бюджэт універсітэта.

Мне ж хочацца звярнуць увагу яшчэ на адзін бок важнай працы гэтага калектыву. Выкладчыкі кафедры працуюць не толькі з замежнымі, але і з нашымі студэнтамі, тымі, хто валодае ў значнай ступені беларускай і рускай мовамі. І гэта не меньш адказны раздзел працы. Справа ў тым, што на усіх нас, і не ў апошнюю чаргу на выкладчыкаў кафедры беларускай мовы, само жыццё ўсклала абавязак выхаваціеля беларускай студэнтскай моладзі. У сучасным свеце, не гледзячы на поспехі ў фізічным выхаванні і спорце, вельмі шмат фактаў, якія сведчаць аб духоўным падзенні і выраджэнні чалавецтва, у тым ліку і моладзі (1;2). Праводзячы заняткі і па моўнаму, і па прафесійнаму навучанню будучых медыкаў, выкладчыкі абавязаны фармаваць светапогляд студэнтаў, выхоўваць у іх здольнасць спачуваць хвораму, гуманізм, любоў да сваёй прафесіі, малой і вялікай Радзімы, аздараўляць іх дух і сумленне, фармаваць гарманічную асобу. У наш час мала хто ўспамінае пра «Кодэкс будаўніка камунізма», а такі існаваў у Савецкім Саюзе і ў пэўнай ступені выконваў гэтую роль. Пасля распаду СССР напрацоўкі па стварэнню гарманічна развітой асобы былі ў значнай ступені страчаны.

Сёнешнія рэаліі ў суверэннай Рэспубліцы Беларусь сведчаць аб тым, што запатрабаванасць у сістэмным выхаванні моладзі не толькі актуальна,

Репозиторий БГМУ

але, нават, вострая. З высокай дзяржаўнай трыбуны, у перыёдыцы і спецыяльнай літаратуры пастаянна падкрэсліваецца, што трывалая сям'я – апора дзяржавы. Нажаль сенешняя статыстыка сведчыць аб тым, што мы страчваем такое разуменне гэтай каштоўнасці, бо больш за палову шлюбаў распадаецца і Рэспубліка Беларусь займае другое месца ў свеце, пасля Расіі, па разводах. Калі ўлічыць паказчыкі па наркаманіі і алкагалізму, праяўленнях эгаізму і паразітычнай псіхалогіі ў грамадскім жыцці, хабарніцтве ад нізу да верху, падмене духоўнасці living рознымі спосабамі нажывы, то становіцца зразумелым, што пытанне па фармаванню і выхаванню высокаадукаванай, высокакультурнай, духоўна-маральнай асобы – жыццёвая неабходнасць і для беларускай дзяржавы, і для беларускага грамадства.

З гордасцю за свой народ паўтараючы словы гімна Рэспублікі Беларусь: «Мы беларусы, мірныя людзі» кожны малады чалавек пачынае усведамляць велічнасць гэтых слоў, а яшчэ і сваё дачыненне да мовы, на якой яно прамаўляецца. У чалавеку прачынаецца святое для кожнага этнаса жаданне – быць адметным у свеце і сваёй гісторыяй, і сваімі працоўнымі, навуковымі і спартыўнымі дасягненнямі, і сваёй культурай і літаратурай, і сваёй мовай. Вось гэта і ёсць тая неацэнная каштоўнасць, якая, на думку гісторыкаў і педагогаў, філосафаў і старажытных мудрацоў павінна дапамагчы нам не толькі навучаць, але і правільна выхоўваць душы маладых людзей – школьнікаў і студэнтаў.

Ужо больш як сто гадоў прайшло з таго часу, як на пытанне, чаго захацелася беларусам? Прагучаў адказ: -»Людзьмі звацца!» Не толькі слухаць гімн на роднай мове, але і думаць, і тварыць на ёй, і карыстацца ёю ва ўсіх сферах жыцця. Спекуляцыі недобразычліўцаў, што гэтая мова нераспрацавана і не дазваляе рабіць на ёй навуковыя і тэхнічныя даследванні і паведамленні – даўно і неаднаразова абвергнуты і прызнаны памылковымі, у тым ліку і намі (3, 4). Яшчэ ў мінулым стагоддзі, як толькі Беларусь атрымала статус суверэннай дзяржавы і ўзнікла хваля адраджэння беларускай мовы, на кафедры Гісталогіі групай выкладчыкаў, якія валодалі гэтай мовай (Бальшова Я. І., Пішчынскі А.В. і аўтар гэтага артыкула) быў складзены «Беларускамоўны слоўнік тэрмінаў» па гэтай дысцыпліне. Мэнэджэрскія здольнасці загадчыка кафедрай спрыялі таму, што пра гэта даведаліся далёка за межамі МДМІ як пра значнае навуковае дасягненне – «стварэнне Беларускай Нацыянальнай Гісталагічнай наменклатуры» пад яго рэдакцыяй. Дзякуючы розгаласу ў прэсе і на тэлебачанні, тады на кафедру звярнуліся студэнты, якія хацелі атрымліваць адукацыю на роднай мове. Паколькі галоўны стваральнік «Беларускай гісталагічнай наменклатуры» беларускай мовай не валодаў, займацца з

такімі студэнтамі на працягу двух семестраў даводзілася мне. Гэтая праца не толькі дазволіла атрымаць добрую моўную практыку, але і паказала, што яна выдатна мабілізуе студэнтаў на творчы пошук. Менавіта дзякуючы ім па кожнай тэме курса мы, працэджваючы не толькі беларускі, але і слоўнікі родственных славянскіх народаў, шукалі найбольш адпаведныя беларускія сінонімы не толькі рускім, але і грэчаскім і лацінскім тэрмінам, і знаходзілі не аднойчы беларускамоўны варыянт больш выйгрышным, чым рускамоўны. (Напрыклад: рус. -матка, бел. -маціца; рус. -щитовидная железа, бел. -шчытавіца; рус. – моча, бел. – брулі; рус. – селезёнка, бел.. – каса;). Студэнтаў настолькі захапіла гэтая праца, што яны выступілі на міжнароднай тэрміналагічнай канферэнцыі са сваімі паведамленнямі, дзе іх плён атрымаў вельмі станоўчую ацэнку і падтрымку спецыялістаў, у тым ліку замежных. Свет убачыў, што беларуская мова вельмі падыходзіць для навуковых прац, а студэнты адчулі гонар і за сваю працу, і за родную мову, на якой рабілі паведамленні. Варта адзначыць, што гэтыя студэнты праз беларускамоўнае навучанне на працягу шасці гадоў дайшлі да дзяржаўных выпускных іспытаў, і іх здалі на выдатна. Жыццё паказала, што мова дазваляе і перадаць, і набыць глыбокія веды па любой з медычных дысцыплін і не згубіцца, як спецыялісту потым. З гэтых людзей выйшлі дактары і кандыдаты медыцынскіх навук, галоўныя і участковыя ўрачы, а што самае каштоўнае – прыстойныя грамадзяне Рэспублікі Беларусь, патрыёты сваёй радзімы.

Дзякуючы маім беларускамоўным студэнтам, карыстаючыся іх парадамі і пажаданнямі, я напісаў першы ў гісторыі беларускамоўны падручнік: «Асновы гісталогіі, цыталогіі і эмбрыялогіі» (3). Большай актыўнасці і зацікаўленасці ў яго стварэнні з боку студэнтаў цяжка было жадаць. Нажаль, масавага ўжывання пры выкладанні гісталогіі беларуская мова на сёнешні дзень не атрымала. Разумеючы, што праца ўрача заўсёды юрыдычна і адміністрацыйна зафармалізавана, група энтузіястаў (выкладчыкі Першай кафедры шпітальнай тэрапіі, Марфалогіі, Лацінскай і Ангельскай моваў) стварылі: «Даведнік напісання дыягназаў па тэрапіі» на рускай, беларускай, англійскай і лацінскай мовах (4), які адпавядае міжнародным стандартам. Гэтая праца была зроблена каб засведчыць моладзі, што беларуская мова існуе і дазваляе і паўнавартасна вучыцца медыцыне і выковаць абавязкі ўрача.

Як вынікае з выказванняў Патрыарха Маскоўскага і ўсяе Русі Кірыла ( 1), галоўным аргументам у размовах з моладдзю сёння павінен стаць **маральны, духоўны аргумент:** – «Если нравственность уходит из жизни общества, то оно превращается в волчью стаю, в банку со скорпионами»

– лічыць Патрыярх. На яго думку –»Основная причина распада Римской империи и древнегреческой цивилизации – состояние нравов в Риме. Рим рухнул только потому, что прогнил человек». Будуючы нашу суверэнную дзяржаву нельга забываць і нам аб маральнасці кожнага нашага крока і ўчынка, уключаючы свой розум і разважанне – «дзве асноўныя каштоўнасці чалавечай прыроды» (Платон); якія, дарэчы, неабходна сістэматычна ўключаць у працу, трэніраваць. Адукацыя і ёсць той сродак, які выхоўвае і развівае розум, пачуцці, свядомасць, волю. Яшчэ старажытныя мудрацы для развіцця розуму раілі шмат чытаць, вучыць напамяць вершы, пісаць творчыя працы, прымаць удзел у інтэлектуальных гульнях. Зразумела, пэўная праца ў гэтым накірунку праводзіцца ўсімі кафедрамі БДМУ. Але з боку актыўных студэнтаў чуюцца пажаданні аб стварэнні пры Кафедры беларускай і рускай мовы – творчага гуртка, ці лабараторыі, дзе б можна было абмяняцца творчымі планамі, разважаннямі, поглядамі, атрымаць адукаванае заключэнне, ці параду ад прафесіяналаў-філолагаў наконт прадукта ўласнай творчасці, ствараць і даводзіць да друку творы студэнтам. Улічваючы наш кантынгент студэнтаў, не выключана і праца па перакладзе твораў з беларускай мовы на іншыя і наадварот. Галоўнае ж прызначэнне такога гуртка – выкарыстаць жаданне, матывацыю і творчы парыў актыўнай часткі студэнцтва для фармавання іх сумлення і волі, бо воля – на думку О. де Бальзака – «Гэта штомінутна атрымліваемая перамога над інстынктамі, спакусамі, перашкодамі, над усялякімі цяжкасцямі». Нямецкі філосаф І. Кант пісаў: «Дзве рэчы напаўняюць душу ўсё новым і ўсё больш моцным задавальненнем, чым часцей і працяглей мы разважаем аб іх – гэта зорнае неба нада мною і маральны кодэкс у ва мне». З гэтага вынікае, што наша сумленне і ёсць наш маральны пачатак і кантралёр. Ветэран педагагічнай працы І. М. Дрыгайлоўскі правы, калі лічыць, што вялікія розумы, пазбаўленыя маралі, нават шкодны і небяспечны для чалавецтва (2).

У эпоху інфармацыйнага ўзрыву востра паўстае пытанне што рабіць, каб вялізны паток інфармацыі не змёў, не сцёр чалавека, не разбурыў яго самабытнасць, яго маральную, духоўную, культурную, і нацыянальную сутнасць. Паколькі гэтыя каштоўнасці знаходзяцца ў традыцыях народа, у яго сказаннях і міфах, то гэтым багаццем абавязкова неабходна карыстацца пры выхаванні моладзі. Менавіта гэта раяць рабіць і старажытныя мудрацы, і сусветна вядомыя філосафы і навукоўцы, і гісторыкі і прызнаныя педагогі. Зразумела, з традыцый патрэбна браць толькі каштоўнае і карыснае, а гэта немагчыма без развіцця і выхавання **свайго** розуму. Як лічыў М. Горкі: «Май розум, і хоць маленькі, ды свой».

Репозиторий БГМУ

Калі ў чалавека свядомасць выхавана правільна, то пры любой сітуацыі не разбурыцца і яго маральнае крэдо.

Жыццё, як вядома, гэта барацьба: барацьба чалавека за праўду, справядлівасць, свае правы, за свабоду и незалежнасць, а компасам з'яўляецца сумленне. Яно – наш маральны пачатак і суддзя. Сёння, для фарміравання базіснай культуры моладзі выкладчыкам і студэнтам патрэбна авалодаць базіснай культурай, звязанай з гісторыяй нашага народа. А гэта – мова і літаратура, якую называюць класічнай. Неабходна адзначыць, што і кіраўніцтва БДМУ, і выкладчыкі кафедры-юбіляркі праяўляюць значную актыўнасць у арганізацыі дзён і тыдня беларускай мовы, сустрэч з беларускімі пісьменнікамі, працы па ўдасканаленню беларускай медычнай тэрміналогіі, патрыятычна арыентаваных вечароў. Улічваючы, што да базіснай культуры адносіцца таксама гісторыя дзяржавы, культуры, адукацыі і рэлігіі, патрэбна зразумець, што тут цэлае неўзаранае поле. Толькі абагаціўшыся гэтай сістэмай каштоўнасцей стане моцнай асоба, а з ёю – і грамадства, і дзяржава. І тады мы, як народ, не згубімся на перакрыжаваннях глабалізацыі. «Чым раней чалавецтва зразумее, што духоўнасць і маральнасць гэта форма выжывання суполкі, сям'і, асобы, грамадства, усёй чалавечай цывілізацыі, тым лепш. Калі зразумее гэта наша моладзь – мы будзем самымі моцнымі, таму што сіла наша ў сіле духа «- лічыць Патрыарх Кірыл. «Каб вывесці моладзь на шлях духоўна-маральнага адраджэння, удасканалення, самаразвіцця яе прыродных задаткаў, здольнасцей і талентаў»– піша ветэран педагагічнай працы І. М. Дрыгайлоўскі – «неабходна інтэгрыраваць ўсе сілы краіны, грамадства, навукі, педагогікі, адукацыі, культуры, спорта, медыцыны, грамадскіх, маладзёвых і прафсаюзных арганізацый, сям'і, царквы для справы гарманічнага выхавання падрастаючага пакалення». Выканаць гэты пачэсны абавязак справа кожнага сапраўднага выкладчыка, настаўніка, выхаваценя, сем'яніна, грамадзяніна Рэспублікі Беларусь. Вялікая мэта вартая гэтага.

**Літаратура**

1. Патриарх Кирилл, «Патриарх и молодёжь» / Патриарх Кирилл. Даниловский благовестник - Москва, 2009
2. Дригайловский, И. М. Каким должен быть выпускник средней школы / И. М. Дригайловский. - Народная Воля, 2019, №79.
3. Арцішэўскі, А. А. Гісталогія з асновамі цыталогіі і эмбрыялогіі / А. А. Арцішэўскі. - Мінск, 2000 – 312 с.

Репозиторий БГМУ